# В рамках свободы творчества

**В истории любой страны есть примеры того, как виртуальные рамки, предлагаемые обществом, становились тесными для творца, и он пробовал выйти за обозначенные красными флажками запретов невидимые, но от того не менее жесткие границы. Творчество бунтарей, ломавших художественные догмы и буквально взрывавших сознание обывателя, оставило свой яркий след в искусстве, но все-таки признанными творцами духовных ценностей и духовного иммунитета нации были те художники, которые дышали в унисон со своим народом, с родной землей, созидая глобальное полотно настоящего и будущего.**

**Сегодня вопросы взаимоотношений художника и государства, роли творческой личности в обществе ставит уже XXI век. Актуальны они и для Беларуси, которой после обретения суверенитета пришлось определять место изобразительного искусства в своей новейшей истории. «Беларуская думка» решила предоставить страницы журнала для заочной дискуссии на обозначенную тему представителям органов государственной власти, общественных организаций и учреждений образования страны. Кстати, большинство из них известны и как художники.**

**– Известный поэт писал о живописи, что «ей, единственной, дано души изменчивой приметы переносить на полотно». С этим трудно не согласиться, но есть, наверное, у этого вида искусства и другое предназначение? Какова, на Ваш взгляд, роль изобразительного искусства и самого художника в жизни общества?**

САВІЧ У.П.: Старажытны філосаф Платон падзяляў усіх людзей на тры катэгорыі, і на першае месца ставіў творчых людзей. І я цалкам згодны з тым, што мастацтва і мастак адыгрываюць вельмі важную ролю ў гісторыі чалавецтва. Творца не можа не ўплываць на грамадства сваімі творамі і нават фактам свайго існавання. Маю на ўвазе сапраўднага творцу, які прапусціў твор праз душу. Станоўчая энергетыка сапраўднага твора мастацтва непазбежна перадаецца гледачу, ён атрымлівае духоўны імпульс. На мой погляд, чалавек, які выйшаў з мастацкай выставы ці пабываў у галерэі, гэта ўжо крыху іншы – лепшы чалавек.



САВИЧ Владимир Петрович – председатель ОО «Белорусский союз художников», заслуженный деятель искусств, лауреат Государственной премии Республики Беларусь, почетный академик Российской академии искусств, профессор

Ці ўзяць, напрыклад, мастака-графіка, які займаецца аздабленнем кніг: на ім ляжыць вялікая адказнасць. Малыя дзеткі яшчэ не разумеюць напісанага слова, але, гледзячы на малюнкі, яны ўжо пачынаюць выхоўвацца. Гэта зрокавая інфармацыя выклікае эмоцыі і думкі, закладваецца на нейкія палічкі ў галаве юнага чалавека. Ведаеце, я і сёння памятаю па малюнках тыя кніжкі, якія матуля мне чытала ў дзяцінстве. Потым далей – падручнікі ўсе… Вось яна, місія мастацтва – вучыць і выхоўваць…

БОРОЗНА М.Г.: Заметная роль художника в общественной жизни – это, в первую очередь, проявление европейской цивилизационной модели. Для нашего материка всегда традиционным было уважение к изобразительному искусству. Но я хочу сказать так: нельзя недооценивать роль изобразительного искусства в обществе, хотя нельзя ее и переоценивать. Нужно воспринимать его так, как оно есть, понимая его чувственно-эмоциональную природу. Разумеется, художники не только как чувственные и эмоциональные, но и очень образованные люди всегда являлись индикаторами общественных явлений, проблем, процессов. Они в своих образах визуализировали современное им состояние общества, и общество воспринимало их мнение как весомое. Однако всегда были в искусстве те, кто делал вывески на лавочках. Это тоже очень уважаемый труд и профессия, но своими взглядами эти люди не определяли пути развития общества и на него не влияли.

**– Немного изменю вопрос. Сегодня государству, конкретно нашей Беларуси нужны изобразительное искусство и сам творец? Каковы их взаимоотношения?**

УРОДНИЧ В.В.: К сожалению, многие, насмотревшись, как проходят аукционы «Кристи» или «Сотбис», считают, что наши художники купаются в деньгах и славе. Они не хотят понимать, что в Беларуси живописец, скульптор, график, прежде всего, человек государственный. Разве может настоящее искусство развиваться вне государственной

политики, вне интересов общества? Но пока у нас художник, работающий на Державу, на каждом шагу слышит от чиновников фразу: «Вы не востребованы». Те, кто хотя бы один раз побывал у профессионального художника в мастерской, пообщался с ним, начинают понимать, как непросто рождается произведение, которое автор «выпускает», для чего он проводит столько бессонных ночей. И тогда уже не возникает вопросов: по какой формуле развивается изобразительное искусство, сколько подобных произведений нужно обществу, кто должен влиять на творческий процесс и в каком ряду должна стоять государственная система... Жизнь художника и общества зависимы. Многие из творцов это понимают и живут в соответствии с этой нормой, но что имеют взамен?

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Выхаваўчая функцыя закладзена ў мастацтве спрадвеку. І ў гэтым сіла мастацкіх твораў і мастака. Што ж наконт адносін мастака і грамадства, дык, на маю думку, паміж імі існуе ўзаемная адказнасць. Вядома, пытанне асабістай адказнасці вельмі тонкае. Мастак сам вызначае ўласную меру і ступень адказнасці перад грамадствам. Але яна абавязкова павінна быць, бо калі ты нарадзіўся ў гэтай дзяржаве, жывеш тут, значыць, маеш і абавязкі перад гэтай краінай, перад гэтай зямлёй...

**САВІЧ У.П.:** Так. Нас вучыла дзяржава, мы ўсе атрымалі прафесію: хто мастак, хто скульптар, графік ці жывапісец і, безумоўна, мы ў адказе перад дзяржавай. А гэта значыць – павінны займацца развіццём мастацтва, культуры, разумеючы пры гэтым, што ствараем імідж нашай краіны. Мне давялося шмат паездзіць па замежных краінах – рабілі персанальныя і групавыя выставы. Першае, што адзначаюць там, – высокі прафесіяналізм беларускага мастацтва і тое, што ў ім ёсць свая нацыянальная нота.

**УРОДНИЧ В.В.:** Лично я уверен, что без чувства ответственности перед обществом, перед Родиной нет художника, да и просто интеллигента. Когда на спортивных состязаниях или иных собраниях звучит государственный гимн и все стоя поют, разве это не апофеоз человеческого восхождения? Эти эмоции имеют продолжение в других делах и поступках. Человек, пообщавшийся



БОРОЗНА Михаил Григорьевич – ректор Белорусской государственной академии искусств, член ОО «Белорусский союз художников»



УРОДНИЧ Владимир Васильевич – член ОО Белорусский союз художников», заслуженный деятель искусств, лауреат специальной премии Президента в номинации «Изобразительное искусство», преподаватель кафедры живописи Белорусской государственной академии искусств

со святынями, по-иному относится к чести, совести, государственным символам. Настоящие произведения искусства, картины, написанные художником-гражданином, художником-патриотом, сродни тем святыням, которые оказывают влияние на людей, воспитывают дух народа. А что же мы сегодня имеем? К сожалению, картина не оптимистичная. За двадцать лет развития страны в новой формации мы не сумели построить ни одной творческой мастерской, создать значимых творений, и процесс идет по нисходящей. Особенно тревожит то, что отдельные чиновники, видя эту проблему, эффективных мер по сохранению положительной практики в художественной культуре не принимают.

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Запатрабаванасць мастака ў нашай краіне сапраўды даволі нізкая. Названая праблема выклікае заклапочанасць, у тым ліку і ў нашага міністэрства. Аднак, шчыра кажучы, тычыцца гэта не толькі мастакоў, але і музыкантаў, прадстаўнікоў іншых творчых прафесій. Арт-рынак у Беларусі, на жаль, слаба развіты, і адна толькі дзяржава не ў стане стварыць і рэгуляваць яго. Хоць такія спробы і робяцца. Вось, напрыклад, для Мірскага палаца і Нясвіжскага замка дзяржавай зроблены заказы мастакам на стварэнне копій партрэтаў Радзівілаў. Аднак такія аб'екты бываюць рэдка...

Відавочна, для выяўленчага мастацтва насталі не самыя лепшыя часы. Але не магу пагадзіцца з тым, што дзяржава зусім не падтрымлівае мастакоў і выяўленчае мастацтва.

**– Вот о поддержке давайте поговорим более подробно. Насколько государство обязано помогать представителям этой уникальной профессии – художникам, или свобода творчества предполагает свободу выживания?**

**БОРОЗНА М.Г.:** Как человек, знающий проблему не понаслышке и занимающийся этими вопросами давно и профессионально, хочу сказать, что общество и государство не уходят от возможности оказания поддержки наиболее перспективным и наиболее востребованным художественным идеям. Это касается в первую очередь цивилизации европейской и Беларуси, как ее части. Но в целом вопрос этот, на мой взгляд, дискуссионный. Я, допустим, про-

тив того, чтобы государство давало какие-то привилегированные позиции художнику – он должен своим трудом добиться этих позиций. Понятно, что художник не может одновременно быть собственным пиар-менеджером и менеджером, который продает его картины агентам, быть творцом, содержать семью, заниматься передачей профессионального опыта. И все равно я против того, чтобы независимо от творческих заслуг раздавались какие-то преференции. Художник должен быть очень образованным человеком, имеющим концептуальные взгляды на вопросы развития искусства, чтобы не только своими работами, а еще выступлениями, публикациями доказать – он имеет право на ту активную роль в жизни общества, на которую претендует. Конечно, его язык – картины, скульптуры либо какие-то дизайнерские проекты. Он, прежде всего, этим должен себя демонстрировать. И лишь тогда государство, оценив его творческие достижения, должно решить вопрос о поддержке.

**САВІЧ У.П.:** Прафесія мастака па прыродзе сваёй дзяржаўная. Місію сваю мастацтва выконвала, выконвае і будзе выконваць незалежна ад таго, як ставіцца да яго дзяржава. І творца, нават калі дзяржаве да яго няма справы, павінен сам адчуваць сваю місію. Я ўпэўнены, што сапраўдны мастак павінен звязваць свой лес і творчасць з зямлёй, бацькаўшчынай, з дзяржавай, урэшце. Яму дадзена Богам многае, і ён павінен гэта спраўдзіць. Дапамагае яму дзяржава ці не...

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Хачу падкрэсліць, што нават само існаванне сістэмы мастацкай адукацыі ў краіне – вялікая заслуга дзяржавы. У Беларусі ёсць школы мастацтваў, студыі – гэта першы ўзровень адукацыйна-выхаваўчай сістэмы, ёсць мастацкія каледжы, вучылішчы, ліцэй... Трэцяя ступень – ВНУ. Сістэма мастацкай адукацыі ў краіне функцыянуе і прыносіць нядрэнны плён. Пра гэта сведчыць вядомасць многіх нашых сучасных мастакоў. Дастаткова ўзгадаць Паўла Татарнікава – лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі. У сферы графікі грыміць на ўвесь свет імя Юрыя Якавенкі. Я ўжо не кажу пра такіх, як Мікола Селяшчук, Леанід Шчамялёў...

**БОРОЗНА М.Г.:** Да, пожалуй, самый важный этап государственной поддержки – существующая система образования: от начального художественного до среднеспециального и высшего, в котором преобладает бюджетное финансирование. О высоком качестве нашего образования говорят иностранцы, которые хотят учиться в Белорусской государственной академии искусств, и в первую очередь их интересует именно художественный факультет. Потому что здесь замечательные педагоги и сильные традиции. Кстати, высокий уровень преподавательского состава в Академии – тоже форма господдержки.



**КОЗЛОВИЧ Михаил Иванович** – начальник управления искусств Министерства культуры Республики Беларусь

**УРОДНИЧ В.В.:** Мне бы хотелось по поводу свободы высказаться. Понятия «свобода творчества» и «свободный художник» в нашей стране приобрели нарицательное звучание. Вместе со свободой творчества художники действительно получили свободу самостоятельного выживания. Единицам удается реализовать свои работы через торговую сеть, но это, подчеркиваю, работает связка «художник – обыватель». Что же делать сложившимся творцам в развивающейся инфраструктуре социально-культурного комплекса страны? Налицо результат новой формулы взаимоотношений художника и государства. Министерство культуры перестало идти в авангарде движения отечественных творцов. Мало того, что нет финансового подкрепления задач, так и сами задачи перед художниками государство не ставит. У художника упал интерес к фигуративной картине, не говоря уж о создании масштабных полотен. Процесс просто вышел из-под контроля государства. Многие этому рады: меньше мысли, меньше материальных затрат. Но что мы оставим потомкам?

**БОРОЗНА М.Г.:** У известного российского художника Василия Нестеренко есть дипломная работа «Триумф Российского флота». Конечно, эта картина не вписывается в обывательское представление об искусстве. Это масштабное полотно о людях, которые создавали российский флот, начиная с Петра Первого, картина огромного гражданского и воспитательного звучания. Посмотреть на нее в российский музей армии и флота приводят кадетов, чтобы они, так сказать, прониклись духом гордости за Отечество. Но по собственной инициативе такие произведения, разумеется, создавать

невозможно. Потому что это колоссальные финансовые затраты на материалы, а они сегодня далеко не дешевы и, к слову, не производятся в Беларуси.

Но все равно я бы так трагически на ситуацию не смотрел. Конечно, проблема есть, но не стоит ее абсолютизировать. Более чем уверен: если человек демонстрирует потенциалы творческие, то общество замечает его и стремится оказать помощь. На протяжении многих лет в Беларуси работает такая система, как специальные фонды Президента по поддержке культуры и искусства, по поддержке талантливой молодежи. Есть еще Фонд культуры и искусства.

**УРОДНИЧ В.В.:** Да, в нашей стране существуют ряд фондов по поддержке представителей искусства, особенно молодых, стипендии Минкультуры, но надлежащего результата нет. Исчез государственный адресный заказ на создание крупных произведений, посвященных значимым этапам жизни страны. Творческая молодежь вообще не знает, что это такое. Могут ли при таком положении появиться значимые полотна?



Иллюстрация П. Татарникова к сборнику белорусских народных сказок

**БОРОЗНА М.Г.:** А мне кажется, что нет смысла создавать произведения по мотивам недавнего прошлого. У нас же общество изменилось, с 1991 года существует новое государство – Республика Беларусь! Но некоторые художники, певцы 1970–1980-х годов, так и живут в том времени. Они хоть одну работу посвятили нынешнему состоянию общества? Я очень уважаю Михаила Андреевича Савицкого, но даже он не написал ни одного произведения о современной Беларуси. Понятно, что он был сформирован в другую эпоху и остался в ней, будучи верным непреходящей военной теме...

**– Похоже, что вырисовались две позиции – «за» и «против» такой формы поддержки художника, как государственный заказ. С одной стороны, она вроде бы изжила себя вместе с советской системой, с другой – пренебрегая этой наработкой прошлого, не рискует ли общество получить вместо высокохудожественных полотен убогие поделки, малюя которые художник стремится прокормить семью?**

**САВІЧ У.П.:** Цяпер амаль кожны мастак працуе ў такім напрамку: што больш успрымаецца, што больш запатрабавана, тое і раблю. Некаторыя проста робяць толькі тыя творы, якія ідуць на продаж. З'явілася такая катэгорыя мастацтва – мастацтва, што добра прадаецца...

Нагадаю, што ў савецкі час існавала сістэма дзяржаўнага заказу. Да кожнай юбілейнай даты ў рэспубліцы ці да юбілею знакавых гістарычных асоб рыхтаваліся выставы. Папярэдне збіраўся мастацкі савет і заключаліся дамовы на стварэнне твораў па гэтай тэматыцы – не з адным, а з многімі мастакамі. Яны прадстаўлялі спачатку свае эскізы, ім выплачвалі аванс, а потым твор, які быў выкананы на вялікім мастацкім узроўні, закупляўся музеем. На вялікі жаль, такой падтрымкі цяпер не існуе. І што атрымліваецца? Толькі адзін прыклад. Сёлета юбілей нашых песняроў Я. Купалы і Я. Коласа. Фактычна юбілейны год ужо ў разгары, але нічога не гудзіць і нават не тлее: з боку дзяржавы няма ніякіх прапаноў да мастацкай супольнасці. І толькі адзінкі з мастакоў, я ведаю, самі працуюць менавіта па гэтай тэме.

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Не згодны з такой пазіцыяй мастакоў: сядзець і чакаць, пакуль Міністэрства культуры абвесціць конкурс. Мы якраз нямала конкурсаў праводзім, асабліва ў такіх жанрах выяўленчага мастацтва, як манументальная скульптура. У мінулым годзе прайшоў конкурс на стварэнне помнікаў Я. Купалу і Я. Коласу. Зараз запрасілі скульптараў да конкурснага ўвасаблення гістарычнай фігуры – караля Міндоўга. Будзе абвешчаны конкурс на помнік Максіму Танку. І гэтак далей. Што ж да палотнаў... Летась да юбілею Максіма Багдановіча міністэрства сумесна з Беларускім саюзам мастакоў праводзіла тэматычную выставу, і лепшыя карціны былі закуплены.

Міністэрства культуры спрабуе праблему падтрымкі айчыннага выяўленчага

мастацтва вырашыць праз сістэму закупак работ сучасных мастакоў. Папаўненне нацыянальнай калекцыі твораў мастацтва – пытанне вельмі важнае. Кожны год на гэтыя мэты закладваецца пэўны аб'ём бюджэтнага фінансавання. Адбіраюцца лепшыя творы як сталых, так і маладых майстроў. Шляхам штогадовых закупак павінны папаўняцца калекцыі не толькі рэспубліканскіх музеяў і галерэй, але і рэгіянальных устаноў мастацтва. Аднак у большасці абласцей работа па закупках мастацкіх твораў ідзе даволі слаба. Выключэнне складаюць Гродзенская і Магілёўская вобласці, ды, бадай, яшчэ Брэсцкая. Зразумела, у рэгіёнах больш заклапочаны вытворчымі справамі, але ж патрэбны і карціны!

А з дзяржаўным заказам усё больш складана. Хоць развіваць гэту сістэму трэба, але варта разумець: поўнасцю вырашыць такім шляхам праблему забеспячэння работай мастакоў мы не зможам. Гэта нерэальна. Аднак і зусім адмаўляцца было б няправільна, бо школа выяўленчага мастацтва ў Беларусі моцная, яна мае сваю нацыянальную самабытнасць, арыгінальнасць, ёсць выдатныя майстры і таленавітыя маладыя мастакі – гэта ж наш нацыянальны гонар!

**БОРОЗНА М.Г.:** В полемике вокруг государственного заказа я вижу борьбу за бюджетное финансирование. Заказ любой ценой! Вот это и беспокоит. Люди просто ратуют за гарантированный гонорар, не обещая взамен никакого качественного результата. И проблема экспертного сообщества здесь становится самой главной. В Беларуси есть Республиканский совет по изобразительному искусству при Минкульте, есть Республиканский совет по монументально-декоративному искусству. В них входят известные художники, архитекторы, искусствоведы, представители органов госуправления. Но члены советов лишь оценивают результаты, а заказ формирует заказчик – органы исполнительной власти. Они фактически создают условия появления этих произведений: проводят конкурсы либо заключают какие-то договоры, предлагают совету оценить ту или иную работу для закупки. И это правильно. Да, было время, когда экспертные советы занимались распределением заказов, но ничего хорошего в том времени на сегодняшний день я не вижу. Потому что это была кормушка для некоторого количества людей.

**УРОДНИЧ В.В.:** В подтверждение своих мыслей и мыслей многих моих коллег о необходимости государственного заказа приведу такие факты: к прошедшим юбилейным датам – 65-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков и 65-летию Великой Победы в стране, кроме произведений студии военных художников «Традиция», входящей в Союз художников Беларуси, не создано новых значимых работ на военно-патриотическую тему. Подобная участь постигла и выставку, посвященную 120-летию М. Богдановича. Вряд ли иная картина будет по итогам юбилейного года Я. Купалы и Я. Коласа. А ведь все названные темы могли бы стать художественной основой для общенационального единения, всплеска патриотизма.



Картина В. Уроднича «На склоне дня». 2001 год

**БОРОЗНА М.Г.:** Конечно, государственной поддержки никогда не будет много, но сказать, что сегодня у нашего изобразительного искусства ее нет, нельзя. Да, систему заказов нужно усовершенствовать. Я считаю, что органам исполнительной власти на местах следует больше опираться на мнение экспертов при формировании заказов. Но и самим художникам надо разговаривать с органами госуправления не языком жалоб, а языком эскизов или уже полотен, но сделанных исключительно талантливо. Нужно не выпрашивать, а показывать свой

интерес к проблемам общества и пробуждать интерес к своей работе.

Вообще же, формировать потенциального заказчика произведений изобразительного искусства – вот самая главная задача на сегодняшний день. К сожалению, когда ходишь по кабинетам чиновников или бизнес-элиты, видишь на стенах один бесконечный пейзаж, как будто написанный одной рукой и разрезанный на множество кусочков. И если по этому визуальному ряду оценивать современное искусство, можно всерьез подумать о случившейся катастрофе. Но, к счастью, наше современное искусство гораздо шире написанных нарциссов или ромашек в трехлитровой банке из-под молока…

**УРОДНИЧ В.В.:** И все же интересно, куда подевался госзаказ, каким нормативным документом он ликвидирован? Да, можно сказать, что договорная система работы с художником себя изжила, но деньги на эти цели выделяются. Только куда они идут? Раньше средства распределялись на конкурсной основе, методом отбора лучших заявок. С гордостью называю такие имена, как М. Савицкий, В. Цвирко, М. Данциг, З. Азгур, А. Бембель, А. Кашкуревич, Г. Поплавский, В. Громыко. Творчество этих и многих других мастеров сформировало золотой фонд изобразительного искусства страны. И выросли эти художники на государственном заказе. Существовали и другие формы поддержки. Впору упомянуть, что жилой дом с мастерскими по улице Сурганова был построен в 1975 году по инициативе руководства Беларуси, которое бывало на всех республиканских выставках. И решение о строительстве второй очереди Государственного художественного музея БССР было результатом продуманной политики в сфере культуры. Понимаю, что всякое большое дело требует больших средств, но кто-то должен, наконец, взяться за него и задействовать огромный потенциал отечественного изобразительного искусства на службу Родине.

**БОРОЗНА М.Г.:** Фундамент этой проблемы значительно шире. Два года назад на совещании у Президента обсуждались вопросы развития отечественного кинопроизводства. Так вот, там прозвучал упрек главы государства кинематографистам, мол, вы просили современную материально-техническую базу, мы вам все дали. А где кино?



**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Сапраўды, не думаю, што справа ў грашах. Справа ў адносінах. Трэба, каб у гэтую сістэму падтрымкі мастака ўключаліся не толькі Міністэрства культуры, але ўсе суб'екты гаспадарання. Трэба, каб у людзей, асабліва тых, хто прымае рашэнні, у мысленні нешта памянялася. І калі, напрыклад, ідзе будаўніцтва дома, офіса, установы, то варта паклапаціцца пра аздабленне і выкарыстоўваць для гэтага жывапіс, скульптуру, іншыя віды выяўленчага мастацтва. І нават набываючы карціну для ўручэння нейкай дэлегацыі ці для афармлення інтэр'ера нельга здраджваць густу – лепш звяртацца да прафесіянальных мастакоў, выбіраць работы высокіх мастацкіх якасцей, тым больш што сёння ў Беларусі гэта не так дорага каштуе.

**– Так, может, стоило бы использовать пресловутый административный ресурс? И вообще, какие еще варианты поддержки художника, кроме госзаказа, видятся Вам перспективными?**

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Я не веру ў адміністрацыйныя шляхі вырашэння гэтага пытання. Калі такі спосаб і дасягае мэты, дык гэта толькі разавая мера – ён не садзейнічае развіццю сістэмы. А гаворачы пра заказ як форму падтрымкі мастака, хутчэй маю на ўвазе заказ у шырокім сэнсе. Нельга і самім мастакам сядзець, чакаючы, што Мінкульт закажа некаму нейкую карціну.

На нашых вачах зараз адбываюцца даволі знакавыя падзеі – прыватны бізнес у Беларусі пачынае паварочвацца ў бок выяўленчага мастацтва. Звяртаючыся ў банкі, Міністэрства культуры апошнім часам знаходзіць усё больш узаемаразумення. Самы яркі прыклад – набыццё «Белгазпрамбанкам» калекцыі карцін беларускіх мастакоў Парыжскай школы 1920-х гадоў. Яшчэ адзін узор – плённае супрацоўніцтва Мінкульта з «Пріорбанкам» па падрыхтоўцы беларускай экспазіцыі на Венецыянскую біенале…

**УРОДНИЧ В.В.:** По поводу биеннале у меня как раз мнение отрицательное. Средства можно было бы потратить с большей пользой. И вообще у художников немало претензий к Минкульту, да и в целом к чиновничьей братии. Отдельные государственные чиновники на государственном же телеканале вещают о том, что художник

может «выдавать на-гора», только когда он голоден! А на радиоканале «Культура» планомерно навязывается мысль о том, что художественное воспитание в стране нужно отдать в руки «компетентных иностранцев»...

Чувства добрые пробуждать в обществе должны как художник, так и аппаратчик, содействующий проникновению этих чувств в души людей. Думаю, что служащим Министерства культуры, да и другим чиновникам, следовало бы начать посещать мастерские художников, постоянно вовлекать их в соревновательный процесс, внимательно следить за ротацией кадров в экспертных формированиях, заботиться о том, чтобы творческие люди были сориентированы не на зарубежный рынок, а продолжали практику живописцев, графиков, скульпторов, монументалистов белорусской школы.

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Ну нельга ж увесь час варыцца ва ўласным катле. У Венецыянскай біенале Беларусь удзельнічала летась першы раз, і рэзананс ад гэтага быў і за межамі краіны, і ў нас. Абавязкова трэба, і мы будзем працягваць укладаць сродкі ў падобныя гучныя праекты. Будзем праводзіць выставы, запрашаць прадстаўнікоў прыватнага бізнесу, рабіць шырокую рэкламу, ствараючы з любой нагоды значную падзею.

На жаль, у нас прынята лічыць: вось ёсць Міністэрства культуры, дык няхай яно ўсім і займаецца. Але ж набліжэнне культурных каштоўнасцей да чалавека, ці наадварот, далучэнне грамадзяніна да твораў мастацтва – гэта складаная дзяржаўная задача. І яна не павінна быць справай аднаго толькі нашага міністэрства. Неабходнасць такой работы ў першую чаргу павінны ўсведамляць нашы СМІ, тэлеканалы, якія з'яўляюцца галоўным і вельмі магутным сродкам уздзеяння на людзей. Каб статус мастака, творцы наогул узняць у дзяржаве, трэба, каб гэта было зразумела не толькі чыноўніку Мінкульта. Моц і важнасць мастацкага ўплыву павінны разумець ва ўсіх органах выканаўчай улады. Ды фактычна чыноўнік любога ўзроўню абавязаны культываваць адпаведныя адносіны да культуры, да выяўленчага мастацтва. І вось калі кожны зразумее і пачне нешта рабіць, тады справа зрушыцца і мы дасягнём поспеху ў выкананні гэтай задачы.

**БОРОЗНА М.Г.:** Мы, кстати, имеем свое представление о том, как это сделать. Академия готова организовывать у себя курсы, посещения для всех интересующихся вопросами изобразительного искусства. Готова направлять своих специалистов, чтобы они рассказывали, что происходит в мировом искусстве позитивного и негативного, что в белорусском...




На открытии Белорусского павильона на Венецианской биеннале. 2011 год

Будем рады читать курс лекций по искусству в Академии управления при Президенте Республики Беларусь, а после реставрации театрального зала, которая сейчас идет в главном корпусе нашего вуза, сможем приглашать значительно больше зрителей на спектакли. И еще – подсказка художникам. Почему бы им самим не инициировать создание какого-то фонда, чтобы подавать заявки на гранты, участвовать в конкурсах... Нужно действительно быть активней: не ждать заказов, а предлагать свои проекты, показывать эскизы и в органах власти, музеям, галереям. Для продажи работ есть сегодня Интернет. Преподавать, работать дизайнером, делать рекламу... Возможности есть, но надо делать все солидно и серьезно. Так мы говорим студентам, это же можем посоветовать и зрелым мастерам.

**– В нашем разговоре уже несколько раз звучала тема студентов, начинающих художников. А действительно, какое будущее ожидает молодых?**

**САВІЧ У.П.:** Цяпер свабода творчасці поўная. Ніхто нікому не перашкаджае:

выказвайцеся на ўвесь голас, выдыхайце, набраўшы паветра поўныя грудзі. У моладзі ёсць магчымасць выстаўляцца, вельмі многа ёсць пляцовак, толькі, на жаль, зусім мала прапаноў ад моладзі. Прыкра, але яны выбіраюць шлях зараблення грошай, камерцыялізацыі. Гэта для мяне асабіста вельмі і вельмі сумна. Калі мы заканчвалі ВНУ, пэўна, час быў лягчэйшы для мастакоў. Але ўсё роўна магу сказаць: калі толькі пайсці зарабляць, то творчая асоба губляе свае сілы.

Дарэчы, у маладзёжнай праблемы ёсць і іншы бок. Мне неаднойчы даводзілася выказвацца з розных трыбун і зараз хачу паўтарыць, звяртаючыся да прадстаўнікоў дзяржавы. Не па-гаспадарску ў нас атрымліваецца: вучым мы маладых мастакоў, шмат гадоў вучым, і пераважна за бюджэтныя сродкі, потым яны заканчваюць Акадэмію, а дзяржава імі не цікавіцца, маўляў, ідзіце куды хочаце.

**БОРОЗНА М.Г.:** Действительно, чтобы стать художником, нужно много учиться: 6 лет в Академии, до этого 4 года в художественном колледже. Да нейрохирургом можно стать за меньший срок! А вот насчет востребованности молодых хочу поспорить: у нас всегда 100 % распределение, очень много именных заявок на выпускников Академии искусств... Наши выпускники имеют две профессиональные квалификации – художник и педагог. То, что художники работают педагогами, принято на всем европейском пространстве – преподают в студиях, школах, колледжах... И у нас в Академии в последние годы увеличился процент молодых педагогов.

**– Есть ли у молодого художника возможность себя показать и вообще – состояться в профессиональном плане?**

**БОРОЗНА М.Г.:** Безусловно. И мы в этом помогаем. Вот итоговая выставка стипендиатов президентского фонда по поддержке талантливой молодежи: авторы 90 % работ – наши студенты и выпускники. Если мы возьмем перечень всех выставок, проходящих в Минске за год, то 10 % составляют там работы наших студентов, 30–40 % – педагогов нашей Академии...

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Існуе таксама галерэя Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе пастаянна праводзяцца выставы мастакоў, што пачынаюць самастойнае творчае жыццё. Як бачна, магчымасцей паказаць сябе ў маладых шмат. Але вось прабіцца сярод сваіх сталых калег пачаткоўцу даволі складана. Каб стаць членам Беларускага саюза мастакоў, трэба мець вельмі салідны багаж выстаў. Выходзіць, што атрымаць падтрымку Саюза можа толькі масціты мастак, той, хто ўжо неяк праявіў сябе.

**УРОДНИЧ В.В.:** Еще более важны вопросы трудоустройства молодых, а точнее, их востребованности. Вспоминаю 1970–1980-е годы, когда художника звали на периферию, и он ехал с желанием, потому что его там ждали. Анализируя кадровую политику, а также работу с молодыми специалистами, оканчивающими Академию искусств сейчас, не скажешь, что их где-то ждут. Знаю, что ежегодно руководство Академии испытывает «головную боль»: как отправить в жизнь два десятка выпускников художественного факультета. Порой рабочие места предоставляют предпринимательские службы, патриархия.



На Республиканской художественной выставке работ стипендиатов специального фонда Президента Республики Беларусь по поддержке талантливой молодежи в художественной галерее «Университет культуры»

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Па-першае, нельга не цаніць тое, што выпускнікам Акадэміі, дарэчы, і платнікам, дзяржавай гарантавана прадастаўляецца першае рабочае месца. Тым не менш пэўная недавыкарыстанасць мастакоў у краіне назіраецца. Варта было б адкрываць новыя рабочыя месцы, асабліва ў рэгіёнах, дзе былі б запатрабаваны людзі з мастацкай адукацыяй. Пакуль жа мастака

сапраўды чакае пераважна выкладчыцкая работа і хутчэй за ўсё ў сталіцы.

БОРОЗНА М.Г.: Просто к сведению скажу, что в той же Германии более полутора десятков художественных академий, множество частных колледжей. У нас же из Академии в год выпускается 6 живописцев. Это же вообще единицы для десятимиллионной страны! И, конечно, в провинции наших выпускников меньше, чем в столице. Но взять, например, Брест, там отлично работают наши скульпторы А. Гурщенкова и П. Герасименко. В Гродно – скульптор В. Пантелеев, графики – Ю. Яковенко, В. Шоба, в Могилеве – А. Суворов, А. Воробьев, в Белыничах – Л. Журавович. Есть множество примеров того, как в регионах живут и творят люди, обладающие высоким потенциалом и известные далеко за пределами Беларуси.

А по поводу трудного пути художника хочу подчеркнуть: изобразительное искусство – это зона колоссального риска. Ты пускаешься в рынок, где нет ни отдела маркетинга, ни плана. И ты должен выжить и добиться результатов. Об этом нужно предупреждать будущих художников сразу: ребята, вы выбрали, наверное, самую рыночную профессию, вас ожидает жесткая конкуренция, плюс ко всему еще и международная.

УРОДНИЧ В.В.: Не будем забывать, что молодому специалисту еще нужно найти мастерскую, где возможно творить, и заплатить за нее на всю катушку. Мне известно, например, что руководство Академии обращалось к облисполкомам с просьбой решить вопрос выделения молодым специалистам-художникам рабочих площадей под мастерские до 30–40 м², с оплатой их по нормам жилья. Но тщетно. Чиновничья рать периферии не хочет понимать, что художника нужно «прищепить» к родной земле, чтобы не думал о загранице. Между прочим, сегодня и зрелому художнику мастерская часто не по карману. Из уст одного чиновника как-то довелось услышать совет: пишите картины на кухне. Так вот, в начале 1990-х мне довелось побывать у одного молодого живописца. В однокомнатной 17-метровой квартире стоял мольберт с двухметровым начатым холстом, а в углу размещалась двухъярусная детская кровать. Дети художника в это время находились, вероятно, в садике, но можно было представить, как они дышат испарениями далеко не безвредных красок



Экспозиция в Центре современных искусств. Минск, 2012 год

и лаков. Будучи в то время государственным чиновником (работал в Министерстве культуры), я немедленно предпринял шаги по приглашению в эту квартиру тогдашнего министра культуры Беларуси Е. Войтовича и председателя Союза художников В. Стельмашонка. После увиденного художник был немедленно «одарен» квартирой и мастерской. Благо, что он имел также убедительные аргументы в творчестве. Но разве можно сосчитать, сколько сейчас таких горемык? Зададимся законным вопросом: кто художнику должен предоставлять рабочее место и на каких условиях? Никто, например, не рассуждает, нужен ли меблированный кабинет чиновнику...

САВІЧ У.П.: Цалкам згодны з калегам. Ці ёсць у нас яшчэ прафесіі, у якіх людзі аплачваюць сваё працоўнае месца? А вось мастакі вымушаны самі плаціць за свае майстэрні. На розных узроўнях задаваў я ад імя Саюза мастакоў гэта пытанне, але ў адказ – маўчанне толькі. Навошта патрэбна мастаку майстэрня? Вось глядзіце – я выкладаю ў Беларускай акадэміі мастацтваў. І як мастак, і як выкладчык я павінен штодня працаваць, каб выкладаць прыстойна, на ўзроўні. Пэўна, можна і па дваіх размяшчацца ў майстэрні, і па некалькі чалавек, як тыя супрацоўнікі ў адным кабінеце, але майстэрня павінна быць. Майстэрня мастака не проста пакой – гэта

аб'ект культуры. Так стагоддзямі складалася. Там ствараецца мастацтва, там робяцца крокі ў вечнасць. І калі асобныя гарачыя галовы прапануюць нам, як казалі ў рэвалюцыйны час, ушчыльніць мастакоў – нашых жывых класікаў, падсяліўшы адзін да аднаго ў майстэрні, дык я гэта ўспрымаю як здзек!

Патлумачу, чаму так абвастрылася гэтая праблема. У Беларускага саюза мастакоў ёсць майстэрні і ўласныя, і якія арандуюцца ў горада. Але зараз плата за камунальныя паслугі, за ацяпленне, ваду так моцна ўзрасла, што многія сябры саюза пішуць заявы, бо не ў стане аплачваць гэтыя свае рабочыя месцы. Плацяжы сталі неймаверныя – сумы выходзяць па 1–3 мільёны ў месяц. Асабліва гэта адбіваецца на пенсіянерах, пажылых мастаках. На якім толькі ўзроўні ні ўздымалі гэтае пытанне, адказ такі – у дзяржавы няма сродкаў... Падобна, што ратаванне тапельцаў – справа саміх тапельцаў. Тым не менш, не адчайваемся – наша задача знайсці магчымасць і дапамагчы тым сябрам Саюза мастакоў, якім зусім не па кішэні такі фінансавы цяжар.

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Міністэрства культуры амаль 2 гады б'ецца над вырашэннем праблемы майстэрняў. І кіраўніцтва Саюза мастакоў ведае, бо мы з імі ў кантакце працуем, наколькі гэта цяжка ідзе, колькі коп'яў зламана. Нарады, дзе спрабавалі выпрацаваць шляхі вырашэння пытанняў, праходзілі не толькі на ўзроўні Мінкульта, але і ў Савеце Міністраў, і ў Адміністрацыі Прэзідэнта. Але ж зараз у айчыннай эканоміцы ўкараняецца тэндэнцыя адмаўлення ад усялякіх ільгот: аднолькавыя ўмовы аплаты электраэнергіі, газу, святла і цяпла прапануюцца як юрыдычным, так і фізічным асобам. Натуральна, што законы эканомікі раней ці пазней будуць уладарыць паўсюдна. Прадастаўленне льгот па аплаце майстэрняў магло б стаць толькі часовай мерай, бо ніякія прэферэнцыі не ўпісваюцца ў новую сістэму. Мясцовыя органы ўлады маглі б падтрымаць мастакоў, аказаўшы садзейнічанне ў аплаце камуналкі. Дарэчы, урад якраз і даручыў органам улады на месцах разгледзець гэтыя пытанні. Цалкам рэальна, напрыклад, абласному Савету дэпутатаў прыняць адпаведнае рашэнне і пагасіць камунальныя плацяжы мастакоў рэгіёна за кошт мясцовага бюджэту. І сумы, упэўнены, будуць не такія вялікія. Выяўленчае мастацтва – гэта ж наш нацыянальны гонар, і мы павінны быць зацікаўлены ў яго падтрымцы, абавязкова трэба прымаць такія рашэнні. Ну хаця б 50 % такіх плацяжоў пагасіць – гэта будзе істотна для мастакоў.



**– Мы много говорили о господдержке. Но в Европе налицо приметы несколько иного отношения к изобразительному искусству. Это и множество частных галерей, и спонсорское участие бизнеса в выставочной деятельности, и поддержка художников меценатами...**

**САВІЧ У.П.:** Нагадаю, што Беларускі саюз мастакоў не дзяржаўная, а грамадская арганізацыя. І мы актыўна займаемся не толькі творчасцю, але і прапагандай айчыннага выяўленчага мастацтва – працуем на імідж краіны. У нас ёсць тры мастацкія галерэі: Палац мастацтваў, Галерэя мастацтва і галерэя «Беларт». Недзе 27–30 выстаў робім у год – групавых, юбілейных, тэматычных. Хачу падкрэсліць: выставачная дзейнасць не дае нам прыбытку. Так у краіне склалася, і не гэтым днём, што любая выстава праходзіць ці «ў нуль», ці «ў мінус». Але мы рабілі і будзем рабіць гэтую справу, бо лічым, што ніякімі грашыма немагчыма вымераць той уклад у грамадскае выхаванне чалавека, які робіць мастацтва. Акрамя таго, праводзім міжнародныя выставы. Мы павінны дэманстраваць сваё мастацтва і культурныя працэсы, глядзець, як выглядае Беларусь на фоне іншых краін, у іншых залах, як людзі нас успрымаюць. І, безумоўна, мы павінны прывозіць у Беларусь экспазіцыі з іншых краін, наладжваць асабістыя кантакты мастакоў – усё гэта дае штуршок развіццю, узаемна ўзбагачае.

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Падабаецца гэта каму ці не, але Беларусь ідзе да заходняй мадэлі, дзе выяўленчым мастацтвам займаюцца і дзяржава, і прыватнік. Мы імкнёмся ствараць умовы для прыватнікаў, каб яны ўкладалі сродкі ў фінансаванне культуры, каб у іх быў не толькі маральны, але і эканамічны стымул развіваць айчынны арт-рынак. Хоць і мала, але ёсць у Беларусі прыватныя галерэі нават у абласных цэнтрах, напрыклад у Віцебску. У Мінску іх болей. Наогул жа інфраструктура выяўленчага мастацтва

у нас пакуль мала развітая – па 3–4 галерэі працуюць у абласных цэнтрах, у Мінску – з дзясятак. На жаль, далёка не ў кожным райцэнтры ёсць мастацкая галерэя, а трэба каб было па 2, па 3. Колькасць выстаў, колькасць наведвальнікаў іх характарызуюць агульны ўзровень культуры ў грамадстве, узровень падрыхтаванасці жыхароў, узровень патрэбы ў творах мастацтва...

Міністэрства культуры імкнецца павышаць цікавасць да выяўленчага мастацтва праз рэалізацыю розных праектаў. Значную частку з іх ажыццяўляем разам з Беларускім саюзам мастакоў. Год таму ў Мінску быў створаны Цэнтр сучасных мастацтваў. Цяпер пры падтрымцы нашага міністэрства там рыхтуецца маштабная выстава. Упэўнены, што трэба пастаянна прыцягваць увагу грамадскасці да мастацкіх падзей, каб людзі пачулі і падумалі: ага, нешта цікавае – трэба схадзіць паглядзець. Так, у стварэнне культу мастацтва неабходна не проста ўкладваць сродкі: усе павінны ўсвядоміць, нарэшце, што выяўленчае мастацтва – адна з асноў развіцця культуры ў грамадстве.

**БОРОЗНА М.Г.:** Мне нравится, что создаются частные галереи и выставки – формальные и неформальные, появляются центры современного искусства... Что касается Академии, то я не знаю в Минске другого такого места, которое могло бы вместить столько работ: у нас есть своя галерея, кроме того, от пола до потолка, включая спортзал и все коридоры, повсюду висят картины. К нам приходят на вернисажи и дипломаты, и чиновники... И со спонсорами работать тоже не считаем зазорным. Весной при поддержке «Приорбанка» в Академии прошел мастеркласс австрийского мастера литографии и выставка его работ. Мало того, заключено четырехстороннее соглашение о сотрудничестве между Академией искусств, «Приорбанком», Форумом культуры Австрии и Университетом Линца. Предоставлены стипендии для наших художников.

**– Многие считают, что в Беларуси происходит постепенная дегуманитаризация разных сфер жизни общества. В системе образования это проявилось исключением из школьной программы уроков мировой художественной культуры. Насколько тревожен этот симптом для художника?**



**БОРОЗНА М.Г.:** Проблема дегуманитаризации меня очень волнует. Беларусь всегда была страной, которая опирается на традиции изобразительного искусства, и визуальный образ для наших людей крайне важен. Если общество хочет иметь позитивный имидж, то этот имидж должен постоянно поддерживаться идеями художников. И в принципе не важно, являются ли они членами Союза художников. Задача у нас одна – формировать визуальный имидж государства. И здесь, и за рубежом. Задача колоссальная, и если она будет реализована, общество заметит и оценит нашу работу.

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Ну, наконт МХК... Я не стаў бы перабольшваць яго выніковасць, бо адносіны да такіх прадметаў у школе не вельмі сур'ёзныя. Лічу, больш у выхаванні культурнага і духоўна развітога грамадзяніна залежыць ад сям'і. Тым не менш нельга скідваць з рахунку і школьны рэсурс. Я нядаўна знаёміўся з вынікамі ЦТ мінулага года па гісторыі Беларусі. Дык аўтары брашуры, якую выдала Міністэрства адукацыі, самі прыходзяць да высновы: горш за ўсё абітурыенты адказваюць на пытанні, якія тычацца культуры Беларусі. Вось такі сумны вынік. Дарэчы, праблему дэгуманітарызацыі мы ўздымалі на Рэспубліканскім грамадскім савеце па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Беларусі, але пакуль яна застаецца без вырашэння... Трэба разумець, што мы рызыкуем атрымаць пакаленні людзей без элементарных мастацкіх ведаў і ўяўленняў.

**САВІЧ У.П.:** У гэтай праблемы ёсць і іншы аспект. Мне часта даводзіцца бываць на выставах, конкурсах дзіцячых, і я ведаю, як нашы дзеткі хочуць маляваць. Але гляджу на гэтыя малюнкі і становіцца крыўдна і сумна: яны малююць прывідаў, герояў замежных мультфільмаў і камп'ютарных гульняў. А ты паглядзі вакол сябе: якое неба, якая зямелька, які двор, які краявід... Значыць, няма каму іх павучыць, як успрымаць навакольны свет, няма каму расказаць, што важна, а што не.

І па наведанні айчынных выстаў ці галерэй магу зазначыць: хацелася б, каб цікавасць у нашых людзей да мастацтва была большай. Бо ніякія сучасныя штукі, ніякі Інтэрнэт і нават мастацкі альбом не заменяць жывога кантакту з творам. Аднак мы не

павінны падпарадкоўвацца абставінам – усё роўна задача мастакоў працаваць, імкнуцца данесці да суграмадзян свае творы. Мастаку трэба прыслухацца да свайго ўнутранага голасу і свету і як мага глыбей, моцна і прафесійна адказаць на пытанні, што яго хвалююць. Тады гэта будзе мастацтва. Але нельга забываць пра тую самую ноту, ноту сваёй зямлі – тады мы будзем цікавыя і ў сваёй краіне, і ва ўсім свеце.

**– Мы много говорили о проблемах. Но, подводя итог дискуссии, хотелось бы услышать какие-то пожелания, посылы в будущее.**

**УРОДНИЧ В.В.:** Творческое сообщество во все времена выполняло функции государственной идеологии, настраивая людей на реализацию главных задач общества. И сегодня государству нужно повернуться лицом к людям, которые создают культуру и искусство. Да, времена переживаем сложные, противоречивые. Но пора уже выруливать на созидательную дорогу, чтобы художественная интеллигенция не оставалась на обочине общегосударственного строительства. А если говорить более конкретно: пора взяться за разработку отечественного кодекса о культуре и искусстве. Наступило время упорядочения творческой жизни тех художников, которые хотят творить не для обывателя, а для Державы.

**САВІЧ У.П.:** Сёння мастацтва сусветнае вельмі разнастайнае, і каб наша беларуская мастакоўская піраміда ўзнялася на высокі ўзровень, усім трэба на гэта працаваць, запаўняць розныя творчыя нішы. І тады абавязкова нехта выйдзе на вяршыню, і будуць зноў на ўвесь свет гучаць імёны, як калісьці гучалі імёны К. Малевіча, М. Шагала, Ф. Рушчыца...

Цяпер многа цікавага прыходзіць да нас з Захаду – з'явіўся нават тэрмін «глабалізацыя мастацтва». Гэта можна ўспрымаць ці не ўспрымаць. Але, самае галоўнае, трэба глядзець праз сваю прызму і разумець, што кожны мастак павінен размаўляць мовай роднай зямлі. І гэта значна шырэй, чым проста размаўляць па-беларуску. Мастак павінен добра ведаць усю спадчыну свайго народа: гісторыю, этнаграфію, фальклор, музыку, літаратуру. І толькі калі ён будзе высокаадукаваным чалавекам, калі будзе ва ўсім гэтым працаваць, ён зможа нешта даць грамадству і здолее знайсці тую высокую ноту, уласцівую нашай зямлі, і панясе яе ў свет.

**БОРОЗНА М.Г.:** Культура – это достояние любой страны и народа. И чем глубже пласт культуры, тем общество и свободнее, и мощнее. Молодым художникам – выпускникам Академии – я всегда говорю: кроме того, что вы хорошо рисуете, помните, что вы – носители уникальной культуры, что



Студенты Белорусской государственной академии искусств на занятиях по станковой живописи

вы из страны, где рождались и работали гении мирового искусства. Не каждая страна может похвастаться таким количеством гениев. И где бы вы ни были – вы должны гордо об этом говорить. И еще должны помнить своих учителей...

**КАЗЛОВІЧ М.І.:** Падкрэслю, што ў павышэнне запатрабаванасці мастака і мастацтва ў краіне можа ўнесці свой уклад кожны суб'ект гаспадарання і кожны асобны чалавек. Хоць працэс культывавання такіх адносін шматгранны і доўгатэрміновы, усім нам варта разумець: калі мастак не будзе патрэбны тут, ён паедзе за мяжу... Уласна кажучы, яны і едуць, і знаходзяць там свае нішы. Не сакрэт, што многія беларускія мастакі на Захадзе вельмі запатрабаваныя – там з поспехам праходзяць іх выставы і карціны купляюць добра. Але крыўдна спадзявацца на тое, што іх пракорміць Захад. Калі ёсць талент, дык грамадства павінна зрабіць усё для яго рэалізацыі, стварыць умовы, каб ён змог знайсці сябе на роднай зямлі.

**Беседовала Татьяна ШАБЛЫКО**